ДУК "Мазырская цэнтральная раённая бібліятэка імя А.С.Пушкіна"

Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

Сектар краязнаўства

# Старонкі гісторыі Мазыршчыны

## Каляндар памятных дат і падзей на 2023 год

https://gallery.mozyrlib.by/

# Каляндар памятных дат
# і падзей на 2023 год

## Агульныя даты

**795 гадоў** з часу бітвы (1228) у ваколіцах Мазыра дружын літоўцаў і мазыран з татара-манголамі. Захоп і знішчэнне горада.

**610 гадоў** з часу, калі (1413) Мазыр з ваколіцамі ўвайшлі ў склад Мазырскага павета Мінскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага.

**435 гадоў** назад (1588) быў прыняты 3-і статут ВКЛ, які юрыдычна запрыгоніў беларускіх сялян.

**375 гадоў** з часу заснавання (1648) у Мазыры Бернардзінскага манастыра, цяпер гэта Міхайлаўскі сабор.

**375 гадоў** з часу, калі пачалася (1648) нацыянальна-вызваленчая вайна ўкраінскага і беларускага народа супраць польскіх феадалаў. Удзел жыхароў Мазыршчыны.

**230 гадоў** з часу, калі адбыўся (1793) другі падзел Рэчы Паспалітай. Тэрыторыя Мазырскага павета перайшла ў склад Расійскай імперыі.

**195 гадоў** з часу, калі праязджаў (1828) праз Мазыр імператар Расіі Мікалай І з сям'ёй.

**185 гадоў** з дня нараджэння **Радзевіча Міхаіла Васільевіча** (1838, г. Мазыр - пасля 1917) беларускага і рускага публіцыста, крытыка, педагога, этнографа. У канцы 19 - пачатку 20 ст. жыў у маёнтку Міцькі на Мазыршчыне.

**170 гадоў** з часу, калі адбылося (1853) падарожжа па Шпілеўскага Паўла Міхайлавіча, беларускага этнографа, пісьменніка, публіцыста, апісанае ў некалькіх кнігах, у т.л. і "Мазыршчына".

**170 гадоў** з дня нараджэння (1853 - сакавік 1927) вучонага-археолага, даследчыка Мазыршчыны **Завітневіча Уладзіміра Зянонавіча.**

**160 гадоў** з часу, калі адбыліся (1863) хваляванні сярод шляхты і каталіцкай часткі жыхароў Мазыршчыны ў падтрымку паўстання ў Польшчы і Беларусі пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага.

**160 гадоў** з часу, калі (1863) у мястэчку Скрыгалаў, вёсках Мялешкавічы, Барбароў, Сядзельнікі, Міхалкі былі адкрыты народныя вучылішчы для дзяцей сялян.

https://gallery.mozyrlib.by/

**150 гадоў** з часу, калі ў в. Слабада (1873) адкрыта народнае вучылішча для дзяцей сялян.

**120 гадоў** з часу адкрыцця (1903) Бібікаўскай сельскай бібліятэкі-клуба. Закрыта 31.11.2015г.

**115 гадоў** з дня нараджэння **Вяргуна Фёдара Іосіфавіча** (1908, в. Скрыгалаў Мазырскага раёна - 1982), народнага казачніка, лекара. У яго рэпертуары былі чарадзейныя і навелістычныя казкі. Ведаў абрадавыя і пазаабрадавыя песні і замовы.

**105 гадоў** з часу стварэння (1918) народнай міліцыі.

**95 гадоў** з часу стварэння (1928) Мазырскай мэблявай фабрыкі. Заснавана на базе запалкавай фабрыкі “Маланка” у г. Мазыры як мэблевая фабрыка “Прафінтэрн”. З 1971 - у складзе “Мазырдрэў”, з 1992 - арэнднае ВА “Мазырдрэў”, з 1997 - ААТ “Мазырдрэў”. У 2012 годзе прадпрыемства ліквідавана.

**95 гадоў** з часу заснавання (1928) Мазырскага завода сельскагаспадарчага машынабудавання “Мазырсельмаш”. Створаны як арцель “Молат”, у 1956 перайменаваны ў ліцейна-механічны завод. Цяпер - ААТ “Мазырскі завод сельскагаспадарчага машынабудавання “Мазырсельмаш”.

**75 гадоў** з часу адкрыцця (1948) гарадской бібліятэкі-філіяла імя Веры Харужай.

**60 гадоў** з часу заснавання (1963) Мазырскага палітэхнічнага тэхнікума.

**55 гадоў** з часу адкрыцця (1968) Козенскай сельскай бібліятэкі.

**50 гадоў** з часу стварэння (1973) Мазырскай птушкафабрыкі.

**50 гадоў** з часу заснавання (1973) у вёсцы Раманаўка музея партызанскай славы.

**30 гадоў** з часу адкрыцця(1993) Лучажэвіцкай сельскай бібліятэкі-клуба.

**25 гадоў** з часу заснавання (1998) міжнароднага фестывалю юных талентаў “Зямля пад белымі крыламі”. Праводзіўся ў Мазыры адзін раз на два гады. Асноўныя мэты - падтрымка маладых таленавітых дзяцей, прапаганда беларускай нацыянальнай культуры, пашырэнне міжнародных сувязей.

https://gallery.mozyrlib.by/

## Студзень

**15** - 85 гадоў з часу ўтварэння (1938) Палескай вобласці з цэнтрам у Мазыры. 8.01.1954г. скасавана, тэрыторыя далучана да Гомельскай вобласці.

**19** - 70 гадоў з дня нараджэння Чорнай Ларысы Пятроўны (19.01.1953 - 2021), рэдактар газеты "Жыццё Палесся" (1990-2021). Выдатнік друку Беларусі, заслужаны журналіст Беларускага саюза журналістаў, лаўрэат прэміі "Залатое пяро".

## Люты

**18** – 120 гадоў з дня нараджэння Языковіча Фёдара Міхайлавіча (18.02.1903 - 7.04.1943), аднаго з арганізатараў і кіраўнікоў партыйнага падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Палескай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Яго імем названа вуліца ў Мазыры.

**20** – 105 гадоў з дня нараджэння Пікмана Ізраіля Цурыелевіча (20.02.1918, г.Мазыр - 1995), беларускага кінааператара і рэжысёра. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1975). З 1990 года жыў у ЗША.

## Сакавік

**22** – 80 гадоў з часу (1943), калі былі знішчаны з насельніцтвам вёскі Казіміраўка (372 чалавекі), Буда-Казіміраўская (131 чалавек).

## Красавік

**4** - 100 гадоў з дня нараджэння Казелька Івана Мікітавіча (4.04.1923 - ?), педагога, кампазітара.

**16** - 100 гадоў з дня нараджэння Барысава Міхаіла Уладзіміравіча (16.04.1923, в. Нараўчызна Мазырскага раёна - 16.04.2012), Герой Савецкага Саюза (1945). Ганаровы грамадзянін г. Мазыра (1982). Зрабіў 47 баявых вылетаў, патапіў дзевяць і пашкодзіў два транспарты праціўніка, удзельнічаў у патапленні лінкора "Шлезвіг-Гальштэйн".

**16** - 60 гадоў з дня нараджэння Дворніка Уладзіміра Андрэевіча (н. 16.04.1963, в. Ровенская Слабада Рэчыцкага раёна), дзяржаўнага дзеяча Беларусі. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі (2001). Працаваў галоўным ветэрынарным ўрачом Мазырскага раёна, дырэктарам прадпрыемства "Саўгас-

https://gallery.mozyrlib.by/

камбінат “Зара”, старшынёй Мазырскага райвыканкама. З 2010 года - старшыня Гомельскага аблвыканкама, Намеснік Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь (2019-2020). У красавіку 2021 года назначаны генеральным дырэктарам ААТ "Мазырсоль".

## Май

**30** - 45 гадоў з дня нараджэння Гелах Наталлі Мікалаеўны (30.05.1978, г.Мазыр), беларускай спартсменкі (веславанне акадэмічнае). Заслужаны майстар спорту Беларусі (2004), майстар спорту Беларусі міжнароднага класа (2000). Бронзавы прызёр XXVII Алімпійскіх гульняў 2004 (Афіны, Грэцыя) і гульняў 2008 (Пякін). Чэмпіёнка свету (2000, Загрэб; 2007, Мюнхен; 2008, Лінц). Чемпіёнка Еўропы (2010). Сярэбраны прызёр чэмпіянатаў свету (2001, 2003). Бронзавы прызёр чэмпіяната свету (2002). Бронзавы прызёр чэмпіяната Еўропы (2008). 7 жніўня 2008 года ўзнагароджана ордэнам Айчыны III ступені.

## Чэрвень

**5** - 80 гадоў з часу (1943), калі была знішчана з насельніцтвам в. Спрымачоў (больш 100 чалавек).

**18** - 75 гадоў з часу заснавання (18.06.1948) Мазырскага аб’яднанага краязнаўчага музея, паводле рашэння Палескага абластнога Савета дэпутатаў працоўных ад 18.06.1948г., як Палескага абласнога краязнаўчага музея. Адкрыты 07.11.1949г. Аснову фондаў склалі экспанаты Палескай абласной выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі 1949 года і этнаграфічныя экспанаты, сабраныя ў вобласці. У структуры музея - выставачная зала (з 1984), музей партызанскай славы ў вёсцы Раманаўка Мазырскага раёна (з 1989), музей-майстэрня мастака-кераміста М.М.Пушкара (з 1991), галерэя творчасці У.А.Мінейкі (з 2005).

**28** - 85 гадоў з дня нараджэння Сіроцкага Анатоля Мікалаевіча (28.06.1938, в. Бібікі Мазырскага раёна), беларускага гісторыка. Кандыдат гістарычных навук (1976), дацэнт (1983).

**30** - 80 гадоў з часу (1943), калі была знішчана з насельніцтвам вёска Касцюковічы (162 чалавека).

## Ліпень

**18** - 115 гадоў з часу адкрыцця (18.07.1908) Мазырскай прыватнай жаночай прагімназіі на базе прыватнага жаночага вучылішча першага разраду. Закрыта ў 1913 годзе.

https://gallery.mozyrlib.by/

## Жнівень

**15** – 120 гадоў з дня нараджэння Ракіцкага Пятра Фаміча (15.08.1903, в. Кустаўніца Мазырскага раёна - 21.10.1977), беларускага вучонага ў галіне генетыкі. Акадэмік АН Беларусі (1967). Доктар біялагічных навук (1940). Прафесар (1940). Заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1973). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1974). Яго імем названа вуліца ў п. Крынічны Мазырскага раёна і вуліца ў г. Мазыры.

**29-30** - 75 гадоў з часу (1943) правядзення Нараўлянска-Шчакатоўскай аперацыі партызанамі атрада імя Кірава, Мазырскага злучэння А.М.Сабурава, імя В.Н.Бажэнкі, у выніку якой былі знішчаны нямецкія гарнізоны ў Нароўлі і вёсках Шчакатава і Слабада Мазырскага раёна.

## Верасень

**2** - 55 гадоў з часу адкрыцця СШ №10 (1963).

**16** - 95 гадоў з дня нараджэння Юдзіна Міхаіла Дзмітрыевіча (16.09.1928 - 2.08.2007), беларускага матэматыка. Доктар фізіка -матэматычных навук (1997). Прафесар (1999). З 1978 года працаваў у Мазырскім педагагічным універсітэце імя І.П.Шамякіна.

**27** - 120 гадоў з дня нараджэння Харужай Веры Захараўны (27.09.1903 - 04.12.1942), дзеяча рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. Герой Савецкага Саюза (1960). Удзельнічала ў барацьбе з бандамі Булак-Балаховіча. Працавала ў Мазыры. У яе гонар названы вуліцы ў в. Слабада Лельчыцкага раёна, Жыткавічах, Мазыры. У Мазыры ўстаноўлены помнік, яе імя прысвоена гарадской бібліятэцы па вуліцы Савецкай.

**28** - 125 гадоў з дня нараджэння Коблава Рыгора Пятровіча (28.09.1898 - 11.10.1988), генерал-маёра, ганаровага грамадзяніна г. Мазыра (1974).

## Кастрычнік

**9** - 75 гадоў з дня нараджэння Уханава Генадзя Васільевіча (9.10. 1948, Камсамольск-на-Амуры), беларускага мастака.

**25** - 105 гадоў з дня нараджэння Дурчына Пятра Сідаравіча (25.10.1918, г.Мазыр - 19.07.1997), беларускага мастака.

https://gallery.mozyrlib.by/

## Лістапад

**6** - 105 гадоў з дня нараджэння Коласа Андрэя Данілавіча (06.11.1918, в. Маісееўка Мазырскага раёна - 15.11.2010), беларускага журналіста. Заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1975г.).

**12** - 200 гадоў з дня нараджэння Шпілеўскага Паўла Міхайлавіча (12.11.1823 - 20.10.1861), беларускага і рускага этнографа, фалькларыста, пісьменніка, даследчыка. Кандыдат багаслоўя (1847). Даследаваў Мазырскае Палессе. Выдаў некалькі публікацый па фальклору, этнаграфіі, гісторыі Палесся.

**15** - 120 гадоў з дня нараджэння Эльмана Андрэя Пятровіча (15.11.1903-1995), савецкі гаспадарчы, дзяржаўны і палітычны дзеяч. Рэктар Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Н.К. Крупскай. Ганаровы грамадзянін г. Мазыра (1993).

**21** - 115 гадоў з дня нараджэння Мацапуры Міхаіла Яфрэмавіча (21.11.1908, в. Барбароў Мазырскага раёна - 31.10.1971), беларускага вучонага ў галіне механізацыі сельскай гаспадаркі. Акадэмік АН Беларусі (1947), Акадэмік сельскагаспадарчых навук. Доктар тэхнічных навук (1945). Прафесар (1947). Заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Беларусі (1954). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1951, 1952), Ленінскай прэміі (1962).

## Снежань

**2** - 155 гадоў з дня нараджэння Шабунеўскага Станіслава Данілавіча (1868, с. Скароднае Мазырскі раён, цяпер Ельскі — пасля 1937, Беламорканал, ГУЛАГ) — беларускі архітэктар, аўтар значнай часткі забудовы Гомеля пачатку XX ст.

**3** - 120 гадоў з дня нараджэння Катаева Міхаіла Максімавіча (03.12.1903 - 26.01.1944), удзельніка вызвалення Гомельшчыны, Героя Савецкага Саюза (1944). Загінуў у баі. Пахаваны ў Мазыры, дзе яго імем названа вуліца.

**22** - 65 гадоў з дня нараджэння Дударэнкі Сяргея Уладзіміравіча (22.12.1958, г. Мазыр). Прафесар, доктар медыцынскіх навук. Член Усерасійскага таварыства тэрапеўтаў, Санкт-Пецярбургскага таварыства тэрапеўтаў, Санкт-Пецярбургскага таварыства імунолагаў.

**30** - 40 гадоў з часу адкрыцця (1983) філіяла - бібліятэкі № 5.

https://gallery.mozyrlib.by/



















**Складальнік і камп'ютарны набор: Цюленева Н.В.**